5. *Шоров, О. Н.* Формирование теории синтеза и пути ее развития [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://proartschool.ru/148-formirovanie-teorii-sinteza.html.

6. 王，秀明。“乐” 字初义研究/秀明王。– 武汉：武汉音乐学院学报第 4 期，武汉音乐学院学报出版社，2005。103 – 106页 = Ван, Сюмин. Исследование базового смысла иероглифа «юэ» / Сюмин Ван // Вестник Уханьской академии музыки. – Ухань : Изд-во «Вестник Уханьской академии музыки», 2005. – С. 103–106.

7. 周，武彦。为 “乐” 字正义/武彦周。– 北京：音乐研究第 1 期，人民音乐出版，1993。– 87 – 89页 = Чжоу, Уянь. Истинное значение иероглифа 樂 («юэ») / Уянь Чжоу // Музыкальные исследования. – Пекин : Народная музыка, 1993. – № 4. – С. 1–4.

8. 冯，洁轩。“乐” 字析疑/洁轩冯。– 北京：音乐研究第 1 期，人民音乐出版，1986。63–65 页 = Фэн, Цзесюань. Анализ сложных мест в этимологии иероглифа «юэ» / Цзесюань Фэн // Музыкальные исследования. – Пекин : Народная музыка, 1986. – № 1. – С. 63–65.

9. 修，海林。“樂” 之初义及其历史沿革/海林修。– 北京：人民音乐杂志第 1 期，人民音乐出版社, 1986。53 – 56 页 = Сю, Хайлинь. Первоначальное значение иероглифа 樂 («юэ») и история его эволюции / Хайлинь Сю // Музыкальные исследования. – Пекин : Народная музыка, 1986. – № 1. – С. 53–56.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Г. В. Чухманава, магістрант БДУКМ*
*Навуковы кіраўнік – А. М. Нароўская,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

## МУЗЕЕФІКАЦЫЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ І АРХІТЭКТУРНЫХ АБ’ЕКТАЎ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАГА МУЗЕЯ-ЗАПАВЕДНІКА «ЗАСЛАЎЕ»

Музеефікацыя, як спецыфічны накірунак музейнай дзейнасці, з’явілася на пачатку 20 ст. Першым, хто звярнуўся да пытання музеефікацыі як адмысловага спосабу захавання помнікаў і выкарыстаў гэты тэрмін, быў музеязнаўца, мастацтвазнаўца, акадэмік Украінскай АН Ф. І. Шмідт (1877–1937(1941)) [7]. Але больш шырока тэрмін стаў выкарыстоўвацца ў савецкай музеязнаўчай літаратуры ў другой палове XX ст.

Што датычыцца развіцця культуралагічных ведаў на сучасным этапе (у рамах якіх існуе і развіваецца беларускае музеязнаўства), то нямногія айчынныя даследчыкі імкнуцца засяродзіць увагу і

ўсебакова асэнсаваць праблемы такой з’явы, як музеефікацыя. А сёння востра паўстае неабходнасць у якасных даследаваннях, прысвечаных пытанням гэтага працэса, бо вялікая колькасць музеяў і ўстаноў музейнага тыпу Беларусі, сыходзячы са спецыфікі сваёй дзейнасці, вымушаны сутыкацца са складана арганізаваным працэсам музеефікацыі. Таму больш грунтоўнае вывучэнне музеефікацыйнага працэсу дасць падставу для таго, каб вывесці дадзеную праблему на якасна новы ўзровень, што дасць магчымасць вылучыць тэорыю музеефікацыі ў самастойную дысцыпліну і інтэграваць яе ў сучаснае музеязнаўства як новы накірунак навуковых ведаў.

Сярод беларускіх даследчыкаў, якія звярталіся да пытанняў працэсу музеефікацыі, варта адзначыць А. М. Сташкевіч, былую старшыню Беларускага камітэта Міжнароднага савета музеяў «ICOM». Яе навуковы артыкул (змешчаны ў зборніку матэрыялаў 1-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Нясвіжскі палац Радзівілаў: гісторыя, новыя даследванні. Вопыт стварэння палацавых музейных экспазіцый») быў прысвечаны разгляду музеефікацыі гісторыка-культурнай спадчыны з пункту гледжання сацыялагічнага, музеелагічнага і канцэптуальнага аспектаў. Аўтар спрабуе ўдакладніць выкарыстанне гэтага паняцця не толькі ў музеелагічным, але і больш шырокім культуралагічным кантэксце, спрабуе вызначыць сувязі паміж ім і роднаснымі яму паняццямі, апраўдаць правамернасць ўжывання гэтага тэрміна ў дачыненні да архітэктурнай спадчыны і культурнага асяроддзя Нясвіжа. Яна, па-першае, прыходзіць да высновы, што музеефікацыя – гэта не толькі стварэнне музейнай прасторы ў прамым сэнсе, але і культурнае засваенне акаляючай тэрыторыі, і па-другое – да ўласнаскладзенага азначэння дэфініцыі «музеефікацыя». На думку А. М. Сташкевіч, музеефікацыя – гэта навукова абгрунтаваны і канцэптуальна вызначаны праект адаптацыі архітэктурнага помніка да сучасных умоў існавання, які, перад усім, мае на мэце захаванне гісторыка-культурных форм у іх арыгінальным варыянце і ўжо затым прыстасаванне пад функцыянальныя патрэбы [4, с. 242–249].

Варта таксама засяродзіць увагу на тым, што адпаведнае нарматыўна-прававое забеспячэнне, якое б давала канкрэтнае вызначэнне сутнасці і зместу і рэгламентавала б парадак дзеянняў працэссу музеефікацыі у Рэспубліцы Беларусь, пакуль не створана [5, с. 268].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дасканалае вызначэнне працэсу музеефікацыі падае Расійская музейная энцыклапедыя. Паводле гэтай крыніцы, музеефікацыя помнікаў – гэта накірунак музейнай дзейнасці і аховы помнікаў, сутнасць якога палягае на пераўтварэнні нерухомых помнікаў гісторыі і культуры альбо прыродных аб'ектаў у аб'екты музейнага паказу для максімальнага захавання, выяўлення іх гісторыка-культурнай, навуковай, эстэтычнай каштоўнасці і актыўнай інтэграцыі ў сучасны культурны кантэкст [8]. Таксама зазначаецца, што адназначнай дэфініцыі музеефікацыі помнікаў не існуе. Спачатку былі вылучаныя дзве формы музеефікацыі помнікаў: выкарыстанне помнікаў пад экспазіцыі і музейныя службы («пад музей»); пераўтварэнне іх у самастойны аб'ект музейнага паказу («як музей», прызнавалася «больш высокай» формай, якая можа быць прынята ў дачыненні да больш каштоўных аб'ектаў). Апошнім часам пераважае меркаванне пра неабходнасць раскрыцця індывідуальных асаблівасцяў і гісторыка-культурнай каштоўнасці помніка як абавязковай умовы музеефікацыі, што супярэчыць яго механічнаму прыстасаванню пад якую-небудзь экспазіцыю, тым больш пад музейныя службы. Адначасова ўсё складаней правесці мяжу паміж дэманстрацыяй помніка як самастойнага аб'екта паказу і выкарыстаннем пад экспазіцыю, калі яна храналагічна і стылістычна адпавядае помніку і спрыяе рэканструкцыі цэласнага мастацкага вобраза.

Акрамя вышэйадзначанага, Расійская музейная энцыклапедыя вызначае музеефікацыю як асобны накірунак музейнай дзейнасці і аховы помнікаў, які ўключае ў сябе не толькі стварэнне аб'ектаў музейнага паказу, але і даследаванне помніка, яго кансервацыю і рэстаўрацыю, захаванне альбо ўзнаўленне мастацка-архітэктурных альбо гісторыка-бытавых інтэр'ераў, а таксама прыроднага і гісторыка-культурнага асяроддзя, інтэрпрэтацыю помніка, арганізацыю ўмоў для яго агляду і г. д. [8, с. 478].

Працэс музеефікацыі шматлікіх археалагічных і архітэктурных аб'ектаў гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе» адбываўся не адно дзесяцігоддзе, і справядліва будзе казаць, што канчаткова ён яшчэ не завершаны. Да музеефікаваных археалагічных аб'етаў музея-запаведніка адносяцца: гарадзішча «Замэчак», гарадзішча «Вал» і курганныя могілкі.

Гісторыю музеефікацыі гарадзішча «Замэчак» трэба адлічваць ад моманту правядзення археалагічных даследаванняў помніка экспедыцыяй А. М. Ляўданскага ў 1926 г. Далей даследаванні га-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

радзішча праводзіў Э. М. Загарульскі ў 1962 г. і Г. В. Штыхаў у 1967 і 1970 гг. Апошнім у 1978, 1979, 1981 і 1988 гг. раскопкі на тэрыторыі гарадзішча праводзіў Ю. А. Заяц. Вынікі яго комплекснай працы дазволілі ідэнтыфікаваць гарадзішча «Замэчак» як рэшткі летапіснага г. Ізяслаўля, звязаныя з паданнем пра князёўну Рагнеду Рагвалодаўну [3, с. 26–27].

На думку Ю. А. Зайца, гарадзішча «Замэчак» – рэшткі ўмацаванага паселішча на паўднёва-заходняй ускраіне Заслаўя. Крэпасць была пабудавана ў апошняй чвэрці X ст. па загаду Уладзіміра Святаславіча як фарпост паўночна-заходніх межаў яго дзяржавы.

Гарадзішча ўмацавана кальцавым валам вышынёй 3 м і шырынёй 13 м, які нёс на сабе зрубную абарончую сцяну з брустверам і дахам, і ровам шырынёй 11 м і глыбінёй 3,5 м. Абарончая сцяна з баявымі пляцоўкамі дазваляла лучнікам весці кругавы абстрэл. Падыходы да знешніх схілаў крэпасці перапынялі бязводны роў і нахілены ў бок ворага частакол. Уезд на пляцоўку засцерагаўся невялікай брамай-вежай. Правільная геаметрычная форма ўмацаванняў была аптымальнай пры існаваўшай у тыя часы тактыцы захопу і абароны [6, с. 35].

Значнай падзеяй у развіцці тэорыі музеефікацыі гарадзішча стала першая экспазіцыя на тэму гісторыі Заслаўя, якая адбылася ў 1985 г. у зале паседжанняў Заслаўскага гарвыканкама. Яе аўтарам з'яўляецца Т. Г. Гаранская. Для гэтай экспазіцыі пад навуковым кіраўніцтвам Ю. А. Зайца мастаком Я. С. Кулікам была выканана графічная рэканструкцыя гарадзішча «Замэчак».

Зараз ў цэнтры гарадзішча ўстаноўлены крыж з нагоды 1000-годдзя хрышчэння Русі.

Гісторыя гарадзішча «Вал», вядомага таксама як заслаўскі замак, пачынаецца на мяжы XI–XII стст. Кальцавая крэпасць, пабудаваная Уладзімірам Святаславічам, была пакінута, а на тэрыторыі правабярэжнага пасада ўзвялі новы, больш магутны дзяцінец г. Ізяслаўля [6, с. 27].

Гарадзішча «Вал» – гэта комплекс абарончых збудаванняў, які размяшчаўся на беразе р. Свіслач, на паўночнай ускраіне старой часткі горада. Першапачаткова ўмацаванні былі ўзведзены на рубяжы XI–XII стст. Валы вышынёй 3–3,5 м, былі насыпаныя з пяску і ўмацаваныя па схілах пластом гліны і каменем. На асобных участках вал умацоўваўся ўнутранымі драўлянымі канструкцыямі. На падставе праведзенага археолагам Ю. А. Зай-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цам даследавання абарончых збудаванняў вылучаны чатыры перыяды іх будаўніцтва і перабудовы: другая палова XIII ст.; XIV ст.; канец XVI ст.; пачатак XVII ст. У выніку ўсіх перабудоў вышыня вала да канца XVI ст. дасягала 8–8,5 м. У час апошняй перабудовы былі ўзведзены бастыённыя ўмацаванні. Галоўны ўʼезд у замак знаходзіўся з паўднёвага боку, паміж паўднёва-ўсходнім вуглавым і паўкруглым бастыёнамі. Ён быў умацаваны двухпавярховай мураванай брамай з арачным праёмам, пабудаванай у канцы XVI – пачатку XVII ст.

Самая значная перабудова гарадзішча «Вал» – будаўніцтва бастыённага замка – адбылася ў канцы XVI ст. і была праведзена ў жыццё ўласнікам горада Янам Янавічам Глябовічам. Замкавая плошча пашырылася да 1,5 га. Вышыня валоў дасягала каля 15 м. Даўжыня курцін вала складала 188, 166, 90 і 60 м. Курціны па вуглах фланкіраваліся чатырма спічастымі бастыёнамі. Яшчэ два паўкруглых бастыёна – паўночны і паўднёвы – засцерагалі падыходы да ўязных мураваных брамаў. Галоўная брама была пабудавана двухпавярховай, з таўшчынёй фасаднай сцяны 2,4 м. Пры дапамозе плацін на рэках Свіслач і Чарніца замкавы роў і прызамкавыя нізіны былі запоўнены вадой штучнага возера. Такім чынам, замак ператварыўся ва ўмацаванне астраўнога тыпу [6, с. 28].

У гэты ж час замкавая архітэктура набывае рысы рэпрэзентатыўнасці. Замкі пачынаюць выконваць функцыю, уласцівую палацава-паркавым ансамблям. На восі, якая злучае абодва ўезда ў заслаўскі замак, быў узведзены парадны палац – рэзідэнцыя ўладальніка.

Да нашых дзён з усіх мураваных збудаванняў заслаўскага замка, пастаўленых па фундацыі Яна Янавіча Глябовіча ў канцы XVI ст., захаваўся толькі пратэстанцкі храм – кальвінскі збор (сёння Спаса-Праабражэнская царква).

У цэнтральнай частцы замка магутнасць культурных напластаванняў дасягае 5,5–6 мм. Яны ўтрымліваюць матэрыялы X–XVIII стст. Выяўлены рэшткі драўляных зрубных пабудоў XII–XVII стст., вулічная драўляная маставая, фундаменты і развалы кафляных печаў. Знойдзены разнастайныя рэчы, якія характарызуюць заняткі і побыт насельніцтва замка; наканечнікі копʼяў і стрэл, страмёны і шпоры, прылады працы рамеснікаў, керамічны і шкляны посуд, разнастайныя вырабы з жалеза, каляровых металаў, рога і косці, шкла, каменя, скуры; манеты, у тым ліку залатыя алтуны і дукаты XVI ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На падставе комплекснага вывучэння можна лічыць, што ў XII–XIII стст. гэта ўмацаванае паселішча было дзядзінцам летапіснага г. Ізяслаўля. У XIV–XV стст. умацаванні адыгрывалі ролю гарадскога замка, а з XVI ст. – уладальніцкага замка, дзе размяшчалася рэзідэнцыя ўладальнікаў горада. У 1676 г. заходняя палавіна замка была перададзена кляштару дамініканцаў.

Да сённяшняга часу на месцы былой крэпасці захаваліся музеефікаваныя рэшткі ўяздной брамы, валы, рвы.

На тэрыторыі г. Заслаўя і ў яго ваколіцах захаваліся даныя пра 10 курганных могільнікаў і 2 асобныя курганы (376 насыпаў). Іх даследвалі: у 1878 г. – Р. Г. Ігнацьеў, у 1880-я г. – М. М. Турбін, у 1921 г. – В. П. Сушчынскі, у 1926 і 1928 гг. – А. М. Ляўданскі, С. Л. Дубінскі, у 1957 і 1965 гг. – Э. М. Загарульскі, у 1960 і 1971 гг. – Т. В. Штыхаў, у 1980 і 1982 гг. – Ю. А. Заяц.

Заслаўскія курганныя могільнікі функцыянавалі з сярэдзіны X ст. да пачатку XII ст., большасць даследаваных курганоў датуецца другой паловай X ст., належыць плямёнам крывічоў, дрыгавічоў, а невялікая колькасць – плямёнам фіна-ўграў і балтаў. Пахавальны абрад у большасці – трупапалажэнне. Знойдзены пахаванні дружыннікаў, свабодных абшчыннікаў, халопаў і рабынь, даследавана адно пахаванне рамесніка. Пахавальны інвентар – зброя (коп'і, сякеры, суслічы, булава), упрыгожванні (скроневыя кольцы, спражкі, пярсцёнкі, бранзалеты, шыйныя грыўні, каралі, прывескі), рэчы хатняга ўжытку (нажы, прасліцы, грабяні, гаршкі, вёдры), манеты.

Музеефікацыя менавіта архітэктурных помнікаў – працэс адмасловы і спецыфічны. Помнікі архітэктуры ў сукупнасці з такімі элементамі, як ландшафт, архітэктурна-планіровачная структура, атачаючая забудова, ўтвараюць гарадское асяроддзе, сацыякультурную значнасць якой складана пераацаніць [9].

Помнікі, якія складаюць архітэктурную спадчыну г. Заслаўя можна падзяліць на 3 групы.

Аб'екты традыцыйнай драўлянай архітэктуры. Яны аб'яднаны паміж сабой ў этнаграфічны комплекс «Млын» і з'яўляюцца цалкам музеефікаванымі аб'ектамі.

Працэс музеефікацыі аб'ектаў этнаграфічнага комплексу «Млын» адбываўся паступова. У 1990 г., пасля рэстаўрацыі, пачаў дзейнічаць першы аб'ект музейнага паказу – будынак паравога млына, помнік народнай архітэктуры пачатку XX ст. У 1992 г. побач з млынам размясціўся музей «Хата завознікаў» – свое-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асаблівая местачковая гасцініца. У памяшканні ўзноўлены інтер'ер пачатку XX ст. У сенцах знаходзяцца невялікая печ, вуглавая шафа, паліцы з керамічным, медным і латунным посудам, стол з самаварам, падвесны рукамыйнік. На сценах вісяць бурносы (зімовая вопратка з гаматнага сукна), а таксама прыстасаванні конскай вупражы. У белым пакоі знаходзяцца кафляная печ, палаці з сеннікамі, канапа і нямецкі маятнікавы гадзіннік, на покуці – абвіты ручніком абраз, падлога заслана дашчаным мостам, сцены атынкаваны і пабелены.

У лютым 1994 г. адбылося адкрыццё музея «Кузня». Будынак быў перавезены з в. Камень Валожынскага раёна. Адноўлены інтэр'ер складаецца з горана, мяхоў, калоды з аднарогай накавальняй, ручнога тачыльнага і свідравальнага станкоў, шматлікіх інструментаў: малаткоў, абцугоў, разакоў і прабойнікаў.

Завяршэннем фарміравання этнаграфічнага комплексу «Млын» стала адкрыццё музея «Свіран». Будынак быў перавезены з в. Міхнічы Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. Галоўны фасад уяўляе сабой галерэю з балконам, парэнчы ўпрыгожаны разьбой. Унутры, уздоўж сцен, цягнуцца засекі для збожжа. Інтэр'ер аздоблены сплеценымі з саломы кашамі, розных памераў кадушкамі, кубламі, а збоку – куфарам [2, с. 195].

Аб'екты культавай архітэктуры: Касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі і былы кальвінскі збор (зараз Спаса-Праабражэнская царква). Абодва помніка архітэктуры сёння належаць адпаведна каталіцкай парафіі і праваслаўнаму прыходу, не з'яўляюцца музеефікаванымі (у разглядаемым вышэй кантэксце музеефікацыі) аб'ектамі і выкарыстоўваюцца па першапачатковаму прызначэнню. У перыяд 1986–1990 гг. у храме размяшчалася экспазіцыя Заслаўскага музея рамёстваў і народных промыслаў Беларусі, які быў філіялам Дзяржаўнага музея БССР [1].

Помнік палаца-паркавай архітэктуры – Эрмітаж палацава-паркавага комплексу Пшаздзецкіх. Пакуль не музеефікаваны аб'ект. Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе» стаў уласнікам аб'екта толькі ў 2011 г. Найважнейшай задачай для музея-запаведніка на сёння з'яўляецца прыстасаванне Эрмітажа палацава-паркавага комплексу Пшаздзецкіх пад сталую экспазіцыю музея горада з магчымасцю выкарыстання яго для часовых выставачных праектаў і мастацкіх імпрэзаў, што цалкам не супярэчыць асноўнаму прызначэнню аб'екта і, ў выніку, паспрыяе новым візітам у Заслаўе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс выкарыстаных крыніц**

*1.* Архіў Дзяржаўнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе». Дакументы да пратаколаў навукова-метадычнай рады за 1990 г. / А. А. Гурбо. Даведка аб музеі рамёстваў і народных промыслаў Беларусі. – 1990 г.

*2.* Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе» / В. І. Казлоўскі [і інш.]. – Мінск : Музеі Беларусі, 2008. – 560 с.

*3. Заяц, Ю. А.* Заслаўскае гарадзішча «Замэчак» / Ю. А. Заяц // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Заслаўя. – Мінск : Белта, 2000.

*4. Сташкевіч, А. М.* Музеефікацыя гісторыка-культурнай спадчыны: сацыялагічны, музеелагічны і канцэптуальны аспекты / А. М. Сташкевіч // Нясвіжскі палац Радзівілаў: гісторыя, новыя даследаванні. Вопыт стварэння палацавых музейных экспазіцый : матэрыялы 1-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. – Нясвіж, 2009. – 34 с.

*5. Чухманава, Г. В.* Эрмітаж палацава-паркавага комплексу Пшаздзецкіх у Заслаўі: праблемы аховы, утрымання, выкарыстання і музеефікацыі аб'екта / Г. В. Чухманава // Замкі, палацы, сядзібы ў кантэксце еўрапейскай культуры : зб. навук. арт. / Мін-ва к-ры Рэсп. Беларусь, Установа «Музей "Замкавы комплекс "Мір"». – Мінск : Медысонт, 2013. – 282 с. : іл.

*6. Заяц, Ю. А.* Заславль X–XVIII веков: Историко-археологический очерк / Ю. А. Заяц ; под ред. Г. В. Штыхова. – Минск : Наука и техника, 1987. – 63 с. : ил.

*7. Кальницкая, Е. Я.* Музеефикация дворцов: актуализация архитектурного наследия в современной теории и практике : автореф. дис. … д-ра культурологии: 24.00.03 / Е. Я. Кальницкая ; Санкт-Петербургский гос. ун-т. – СПб., 2005. – 50 с.

*8. Каменецкий, И. С.* Музеефикация памятников / И. С. Каменецкий, М. Е. Каулен // Российская музейная энциклопедия. – М. : Прогресс ; М. : РИПОЛ классик, 2005. – 848 с. : ил.

*9. Пономарева, М. В.* Музеефикация городской среды (на примере Санкт-Петербурга) : автореф. дис. … канд. архитектуры: 18.00.01 / М. В. Пономарев ; Санкт-Петерб. гос. академ. ин-т живописи, скульптуры и архитектуры им. И. Е. Репина. – СПб., 1994. – 27 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*А. В. Щитцова, аспирант БГУКИ*
*Научный руководитель – Ю. П. Бондарь,*
*кандидат политических наук, доцент*

## СЕМИОТИКА ПРАВОВОЙ КУЛЬТУРЫ

Информационно-семиотическая концепция культуры характеризует культуру как социальную информацию, которая сохраняется и накапливается в обществе с помощью создаваемых